*Міхась Пазнякоў*

# Чалавек шчырай, таленавітай душы

Валянціна Іванаўна Локун… Гэтую абаяльную, інтэлігентную, таленавітую жанчыну згадваю заўсёды з асаблівай павагай і прыемнасцю. Дасведчаная, уважлівая, простая і шчырая ў размове, яна здзіўляла шырынёю творчых інтарэсаў, глыбінёю разважанняў, адметнасцю адухоўленай душы. І ў кватэры, дзе яна жыла, панавала атмасфера працавітасці, добразычлівасці, радаснай зацікаўленасці гасцямі.

Мне пашчасціла сустракацца і размаўляць з Валянцінай Іванаўнай некалькі разоў. Працуючы ў рэдакцыі літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага часопіса «Нёман», мы, кіраўнікі выдання, плённа супрацоўнічалі з вядомымі пінскімі літаратарамі: Валерыем Грышкаўцом, Юрыем Саланевічам, Мікалаем Елянеўскім, Анатолем Шушко, Марыяй Ляшук, і, безумоўна, з Валянцінай Іванаўнай Локун.

Не магу не прывесці некалькі цытат з яе выдатных літаратуразнаўчых артыкулаў. Так, разважаючы пра творчасць І. Шамякіна ў артыкуле «Іван Шамякін: у пошуку маральнага ідэалу» (Нёман. 2003. № 10), яна слушна заўважае: «Любоў уратуе чалавека, а праз яго і ўвесь род людскі, — такі вывад маральных пошукаў Івана Шамякіна…».

Разглядаючы творчасць вядомых беларускіх празаікаў К. Чорнага, М. Лынькова, І. Чыгрынава, М. Гарэцкага, В. Быкава, У. Гніламёдава ў кантэксце сусветнай прозы, даследчыца робіць вывад: «Мадэль хрысціянскага ўладкавання свету — важнае дасягненне сучаснай літаратуры, у тым ліку і ваеннай, як адной яе састаўной часткі».

Валянціна Іванаўна была не толькі нашым выдатным аўтарам, літаратуразнаўчымі артыкуламі якой зачытваліся падпісчыкі часопіса, але і кансультантам. Асабліва пры падрыхтоўцы спецыяльных нумароў, прысвечаных творчасці літаратараў Брэстчыны. Падчас прыездаў у Пінск па рэдакцыйных і іншых творчых справах, мы, супрацоўнікі «Нёмана», безумоўна, не маглі абмінуць кватэру гасцінных Евы Аляксандраўны, Валянціны Іванаўны і Васіля Іванавіча Локунаў. Нас сустракаў дух непаўторнай душэўнасці, сапраўднага творчага свята, непадробнай сяброўскай узаемапавагі і ўзаемаўдзячнасці. Валянціну Іванаўну цікавіла і хвалявала ўсё: стан развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі, творчае грамадскае жыццё, напоўненасць рэдакцыйнага партфеля, сувязь рэдакцыі з дзяржаўнымі структурамі, з грамадскасцю, чытачамі. І нас заўсёды здзіўляла яе дасведчанасць, вартыя прапановы і заўвагі, парады і нечаканыя ідэі. Яна ніколькі не была адарванай ад шырокай літаратурнай плыні, як у нашай краіне, так і ў Расіі, у блізкім і далёкім замежжы. Ёй вельмі па душы былі нашы творчыя праекты, звязаныя з сучаснай літаратурай Расіі. Уразіў яе наш «Пісьменніцкі цеплаход» — паездкі пісьменнікаў Мінска і Піншчыны на цеплаходзе па Піне і Прыпяці з творчымі выступленнямі, выхадамі на бераг…

Надзвычай хораша было абмяркоўваць з Валянцінай Іванаўнай новыя кнігі, выдатныя сучасныя творы. Як высокапрафесійны літаратуразнавец і крытык тут яна была нібы рыба ў вадзе. Заўсёды па-добраму я зайздросціў яе шырокаму і разнастайнаму кругагляду, зацікаўленаму стаўленню да літаратуры, арыгінальных творчых знаходак. Памятаю, як захоплена яна гаварыла пра эпапею Уладзіміра Гніламёдава, пра яго раманы «Уліс з Прускі» і «Усход». І рабіла прыемную выснову: «Нарэшце ў беларускай літаратуры з'явіўся важкі, магутны твор, які адлюстроўвае вялізны і малавядомы пласт народнага жыцця…».

У адну з сустрэч я падараваў шаноўнай Валянціне Іванаўне сваю кнігу вершаў «Святое правіла», выдадзеную ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Яна адразу пачала чытаць яе. Першыя два вершы грамадзянскага гучання, крыху пафасныя, прабегла моўчкі. А на трэцім «Добры дзень, радзіма» засяродзіла ўвагу.

Пачала цытаваць:

«Расхіну ў лагчыне

Туманоў кудзель
І адчую сініх
Незабудак хмель…

— Во! Гэта — паэзія, гэта кранае, вось так і пішыце, Міхась, — пра роднае, дарагое, перажытае, прапушчанае праз сэрца. Такія вершы закрануць душу, будуць жыць…».

І сягоння ўспамінаю В. І. Локун з усведамленнем значнага ўкладу яе ў развіццё літаратуразнаўчай справы, як чалавека высокай, прыгожай душы. І мне было надта прыемна ў адзін з прыездаў у Пінск уручыць пісьменніцы ад імя кіраўніцтва нашага творчага саюза вышэйшую ўзнагароду Саюза пісьменнікаў Беларусі — медаль «За вялікі ўклад у літаратуру».

*Мінск, снежань 2019 г.*